А.Т. Арбузов; под общ. ред. Б.М. Хрусталева. – Минск: БНТУ, 2006. – 232 с.
4. *Гракина, Э.И.* Ученые – фронту. 1941–1945. / Э.И. Гракина. – М.: Наука, 1989. – 256 с.
5. *Гуленко, В.И.* Воспоминания Н.М. Никольского «Как мы пришли к партизанам» / В.И. Гуленко, В.Ф. Шумейко // Археографический ежегодник за 1982 год. – М.: Наука, 1983. – С. 268 – 275.
6. Институт истории Национальной академии наук Беларуси (1929–2009 гг.) / А.А. Коваленя [и др.]; НАН Беларуси. Ин-т истории. – Минск: Беларуская навука, 2009. – 628 с.
7. *Комаров, В.С.* Михаил Алексеевич Безбородов. К 70-летию со дня рождения / В.С. Комаров, Э.Э. Мазо // Вести АН БССР. Сер. хим. навук. – 1968. – № 4. – С. 126 – 128.
8. *Красовский, Н.И.* Высшая школа Советской Белоруссии / Н.И. Красовский. – 2-е изд. – Минск: Вышэйш. шк., 1972. – 330 с.
9. *Кузьменко, В.И.* В суровые сороковые: Интеллигенция Беларуси в Великой Отечественной войне (1941–1945 гг.) / В.И. Кузьменко; под ред. А.М. Литвина. – Минск: Институт истории НАН Беларуси, 2006. – 260 с.
10. *Левшин, Б.В.* Советская наука в годы Великой Отечественной войны / Б.В. Левшин; под ред. М.П. Кима. – М.: Наука, 1983. – 384 с.
11. *Мицкевич Н.* Дорогой трудной неизведанной / Н. Мицкевич, Т.Петкевич, Н. Арико // За передовую науку. – 1989. – 21 апр. – С. 4.
12. Наука и техника Советской Белоруссии в 1917 – 1990 гг.: Хроника важнейших событий / сост. Г.В. Корзенко [и др.]; под ред. П.Т. Петрикова. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 191 с.
13. *Соломонов, А.* Он обладал даром научного предвиденья. (К 100-летию со дня рождения академика АН БССР В.В. Попова) / А. Соломонов // За передовую науку. – 1987. – 20 февр. – С. 6.
14. *Тяжкий, А.* Профессор в штормовке / А. Тяжкий // Знамя юности. – 1981. – 13 сент. – С. 2.
15. Ученый, педагог, общественный деятель. (К 90-летию со дня рождения академика АН БССР Н.Ф. Ермоленко) / В. Солдатов [и др.] // За передовую науку. – 1990. – 26 янв. – С. 4.
16. Центральный научный архив НАН Беларуси. – Фонд. 2. – Оп. 1. – Д. 2305. Личное дело Томина Михаила Петровича
17. *Шишко, Е.* Развитие и деятельность Минского государственного медицинского института (1921 – 1971 гг.) / Е. Шишко; под ред. Д.П. Беляцкого. – Минск: Беларусь, 1971. – 176 с.

Summary

The work of scientists of the Republic of Belarus during the Great Patriotic War is shown. The main directions of scientific activity based on various sources, the contribution of scientific intelligence to mobilization of the county's resources for defence needs, supplying national economy with raw materials are revealed

Паступіў у рэдакцыю 31.03.2010 г.

УДК 947.084.8«1942/1944»

А.А. Крываро т,
старшы выкладчык кафедры паліталогіі і права БДПУ

УЗАЕМАДЗЕЯННЕ БЕЛАРУСКІХ І РАСІЙСКІХ ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР У 1942–1944 гг.

Тэма ў якасці самастойнай у гістарыяграфіі не разглядалася. Некаторыя звесткі аб баявой садружнасці беларускіх і расійскіх партызан у названым рэгіёне ёсць у працах А.І. Зевелава, К.І. Казака, А.В. Касовіча, А.С. Фядотава, А.Ф. Хацкевіча і Р.Р. Кручка, Г.А. Шубіна, М.А. Якубоўскага [14; 18; 21; 49–50; 52; 54]. *Мэта артыкула* – на аснове архіўных матэрыялаў, мемуарнай літаратуры, інфармацыі з кніг «Памяць» гарадоў і раёнаў Беларусі паказаць сумесную дзейнасць беларускіх і расійскіх партызанскіх сіл па фарміраванні атрадаў і брыгад, правядзенні ўдараў па камунікацыях і гарнізонах нямецка-фашысцкіх войскаў на тэрыторыі заходніх абласцей БССР.

Узаемадзеянне ў межах гэтага рэгіёну пачалося вясной 1942 г., калі закінутыя сюды армейскія групы і атрады сумесна з мясцовымі патрыётамі ўключыліся ў разгортванне партызанскага руху. Так, у красавіку на мяжы Вілейскай і Мінскай абласцей з'явілася група Галоўнага разведупраўлення Генштаба (ГРУ ГШ) М.М. Багатырова. На працягу лета – пачатку восені 1942 г. яна сфарміравала з жыхароў Ільянскага і Лагойскага раёнаў, груп ваеннаслужачых-акружэнцаў атрады імя К.Я. Варашылава, «Камсамолец», камандзірамі якіх сталі афіцэры-разведчыкі Б.В. Мацюгін, А.М. Захараў і К.К. Рошчын [10, л. 171; 15, л. 3, 13; 41, с. 174–175]

У маі 1942 г. некалькі груп з атрада ГРУ ГШ Р.М. Лінькова з мэтай пашырэння дыверсій на камунікацыях праціўніка былі перабазіраваны з поўдня Віцебскай вобласці на захад БССР, дзе займаліся таксама арганізацыйным афармленнем партызанскага руху. Група В.В. Шчарбіны да жніўня 1942 г. колькасна выраслa за кошт мясцовых жыхароў і аформілася ў атрад, які аб'яднаў вакол сябе падраздзяленні Налібоцкай пушчы на мяжы з Баранавіцкай вобласцю. Група В.А. Чаркасава на працягу чэрвеня 1942 г. у раёне возера Нарач далучыла да сябе мясцовыя групы А.І. Запявалава і А.С. Азончыка і арганізавалася ў атрад імя С.М. Будзённага. Пры падраздзяленні быў створаны савет па каардынацыі дзейнасці партызанскіх атрадаў у Радашковіцкім, Ільянскім і Маладзечанскім раёнах. У пачатку снежня 1943 г. на базе атрада імя С.М. Будзённага былі створаны чатыры новыя атрады. Асноўная частка атрада Р.М. Лінькова колькасцю 65 чалавек да канца чэрвеня 1942 г. перамясцілася ў Пінскую вобласць. У новым раёне на працягу ліпеня – жніўня яго камандаванне ўключыла ў свой склад партызанскія групы капітана С.П. Каплуна, лейтэ-

нанта Мірава, Г.М. Картухіна і інш., з якіх потым былі аформлены новыя атрады. У канцы 1942 г. шэсць такіх падраздзяленняў былі накіраваны для правядзення дыверсійна-разведвальнай дзейнасці на тэрыторыі Украіны. Акрамя таго, у жніўні – пачатку верасня прадстаўнікі падраздзялення ГРУ ГШ І.М. Чорны і А.П. Брынскі наведалі партызанскія атрады ў раёне Выганаўскага возера і аказалі ім практычную дапамогу ва ўмацаванні дысцыпліны, у расстаноўцы камандна-палітычных кадраў, арганізацыі ўзаемадзеяння, устанаўленні сувязі з Цэнтрам [5, с. 207, 231, 235, 254, 256, 272; 6, с. 174, 185, 187, 201, 229–233, 296; 8, л. 165; 10, л. 171; 25, с. 327, 333; 29, л. 197; 30, л. 13–14; 50, с. 221–222].

З вясны 1942 г. у заходнія вобласці БССР пачалі пранікаць і групы Заходняга фронту. Адна з іх пад камандаваннем лейтэнанта «Цыганка» колькасна выросла ў Івянецкім раёне і ў сакавіку 1943 г. аформілася ў атрад імя Знаменскага. Значны ўплыў на разгортванне партызанскага руху на тэрыторыі Брэсцкай вобласці аказала група І.П. Топкіна, дэсантаваная ў верасні 1942 г. на поўдзень Косаўскага раёна. Для арганізацыйнага ўмацавання мясцовых атрадаў, якія не мелі адзінага кіраўніцтва, у іх былі накіраваны прадстаўнікі армейскага падраздзялення. У першай палове кастрычніка 1942 г. у атрадах А.П. Чарткова, Д.С. Дзмітрыева, Ю.С. Бярэнчыка, Я.Г. Макарэвіча была адменена выбарнасць камандна-палітычнага саставу, створаны сямейныя лагеры, якія аддзялілі ад баявых. Пад канец восені 1942 г. пад кіраўніцтвам І.Ф. Топкіна знаходзіліся шэсць атрадаў, у тым ліку два непасрэдна аформленыя армейскай групай. У снежні 1942 г. па прапанове Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта армейскае падраздзяленне прыняло пад сваё камандаванне атрады «Савецкая Беларусь» і імя С.М. Кірава, а таксама невялікія групы, якія дыслацыраваліся ў Булінскіх лясах. Па прыбыцці ў Брэсцкую вобласць вясной 1943 г. падпольнага абкама КП(б)Б на чале з С.І. Сікорскім, яму было перададзена дзесяць атрадаў, дзейнасць якіх да гэтага каардынавалі армейскія разведчыкі [2, л. 9; 9, л. 88; 17, л. 235; 26, с. 402, 417–419, 424, 443; 36, с. 177, 186, 195; 41, с. 60, 159; 51, с. 43, 64, 87–91; 52, с. 127; 53, с. 61–62].

Асаблівасць дзейнасці армейскіх груп у заходніх абласцях БССР была абумоўлена тым, што тут толькі вясной 1943 г. сфарміраваліся падпольныя абкамы партыі і стала ўстанаўлівацца ўзаемная сувязь мясцовых партызан, ЦК КП(б)Б, БШПР. Большасць кіраўнікоў спецгруп дзейнічала ў кантакце з камандаваннем мясцовых партызан, дапамагала ім вырашаць арганізацыйныя і баявыя задачы. У той самы час у некаторых даследаваннях прысутнічае крытыка на адрас камандавання падраздзялення І.Ф. Топкіна за тое, што яно без уліку сітуацыі імкнулася падпарадкаваць сабе атрады рэгіёну і выкарыстоўваць іх выключна ў вузкіх мэтах разведкі і дыверсій, а таксама ўстанавіць там свае правілы папаўнення асобовым складам [7, с. 269–270; 9, л. 88; 17, л. 235; 48, с. 7; 52, с. 127].

З падраздзяленняў НКУС СССР, якія дыслацыраваліся ў заходніх рэгіёнах БССР, найбольш рэзультататыўна займалася пашырэннем партызанскага руху спецгрупа «Сокалы» (камандзір К.П. Арлоўскі). З канца кастрычніка 1942 г. і да сакавіка 1943 г. за кошт жыхароў Ганцавіцкага, Клецкага і Ляхавіцкага раёнаў група выросла з 10 да 200 чалавек, што дало магчымасць стварыць на яе базе ў красавіку – маі 1943 г. тры партызанскія атрады: імя Кірава (камандзір М.П. Боцін), імя Свярдлова (камандзір В.С. Халецкі) і атрад К.П. Арлоўскага [3, с. 183–185; 14, с. 128; 38, с. 313].

Значна актывізавалі партызанскі рух на тэрыторыі Баранавіцкай і Вілейскай абласцей атрады і групы, скамплектаваныя ў савецкім тыле пры ўдзеле партыйных і камсамольскіх камітэтаў расійскіх рэгіёнаў. З канца 1942 г. на тэрыторыі Івянецкага раёна пачала дзейнічаць група «Рошча» ў складзе добраахвотнікаў Краснаярскага краю. Да вясны 1943 г. яна колькасна выросла і аформілася ў атрад. З сакавіка па жнівень 1943 г. атрад Смаленскай вобласці «Кастрычнік» (камандзір Ф.К. Юрчанка) уключыў у свой склад сотні жыхароў Дзісненскага, Міёрскага, Пліскага раёнаў і на гэтай аснове стварыў чатыры новыя падраздзяленні. Вясной 1943 г. ЦШПР накіраваў на тэрыторыю Баранавіцкай вобласці чатыры групы сібіракоў-добраахвотнікаў ад Новасібірскага абкама УКП(б). Групы М.В. Пронькіна і М.І. Сабаева з мясцовымі жыхарамі стварылі атрады «Сібірак» і імя С.М. Кірава. Група сібіракоў на чале з Ц.Ф. Пуцілавым у Івянецкім раёне аб'ядналася з групамі У.В. Чужанава і Я.А. Прыданнікава ў партызанскі атрад «Бальшавік». Група І.К. Кузняцова ў раёне возера Нарач папоўнілася мясцовымі жыхарамі і аформілася ў атрад «Сокал» [22, л. 50, 52, 57, 57а; 16, л. 28–29; 20, с. 249–250; 32, л. 88; 33, с. 154–155; 37, с. 179; 41, с. 62, 91].

Па нашых падліках, у заходнія вобласці БССР з вясны 1942 г. па чэрвень 1944 г. па лініі структур Чырвонай Арміі, кіраўніцтва НКУС (НКДБ) СССР, партыйных і камсамольскіх камітэтаў тылавых рэгіёнаў РСФСР было накіравана 28 груп, якія далучылі да партызанскай барацьбы тысячы мясцовых жыхароў і сумесна сфарміравалі 29 атрадаў.

Важным напрамкам арганізацыйнага ўзаемадзеяння беларускіх і расійскіх партызан на тэрыторыі заходніх абласцей БССР было сумеснае фарміраванне брыгад. Да пачатку функцыя-

навання на тэрыторыі заходніх абласцей БССР падпольных абкамаў КП(б)Б і рэгіянальных партызанскіх штабоў ініцыятарамі ўзбуйнення партызанскіх сіл у месцах сумеснага базіравання беларускіх і расійскіх атрадаў выступала камандаванне армейскіх баявых адзінак. Так, па загадзе камандзіра атрада ГРУ ГШ Д.І. Кеймаха ў лістападзе 1943 г. на тэрыторыі Налібоцкай пушчы былі створаны брыгады імя І.В. Сталіна (камандзір П.І. Гулевіч) і імя В.П. Чкалава (камандзір С.П. Смірноў), а ў снежні 1942 г. на тэрыторыі Ліпічанскай пушчы – Ленінская брыгада. У канцы лютага 1943 г. з трох асобных атрадаў у раёне Налібоцкай пушчы была сфарміравана брыгада імя Г.К. Жукава (камандзір С.С. Ключко) [4, л. 173, 178; 21, с. 102; 31, л. 210, 235; 41, с. 28–29, 31, 43, 67, 173–175; 43, л. 36; 44, л. 42; 45, л. 45; 46, л. 48].

Адно з першых злучэнняў у Вілейскай вобласці арганізавана камандзірам групы ГРУ ГШ М.М. Багатыровым, які 4 студзеня 1943 г. сваім загадам аб'яднаў партызанскія атрады, створаныя армейскімі разведчыкамі ў брыгаду імя М.В. Фрунзе. Яшчэ адна брыгада ў гэтай вобласці – імя С.М. Будзённага – сфарміравана ў снежні 1943 г. рашэннем Вілейскага партызанскага цэнтра на базе атрада ГРУ ГШ М.А. Чаркасава. Брыгада «Кастрычнік» была створана Вілейскім падпольным абкамам КП(б)Б шляхам рэарганізацыі аднайменнага партызанскага атрада Смаленскай вобласці [15, л. 2, 13; 19, с. 343–344; 22, л. 52, 57, 57а; 26, с. 544–545; 29, л. 196–197, 201; 42, л. 38].

Удзел сібірскіх падраздзяленняў у арганізацыі брыгад ажыццяўляўся праз іх аб'яднанне з мясцовымі атрадамі на аснове загадаў упаўнаважаных ЦК КП(б)Б і БШПР у адпаведных рэгіёнах. Партызанскую брыгаду «Уперад» Баранавіцкай вобласці сумесна з мясцовымі атрадамі фарміравалі сібірскія падраздзяленні «Бальшавік» і «Сібірак». Адным са стваральнікаў брыгады «Камсамолец» у гэтай жа вобласці быў атрад сібіракоў «Сокал». Яшчэ адзін сібірскі атрад – імя С.М. Кірава (камандзір М.І. Сабаеў) – са жніўня і да лістапада 1943 г. дзейнічаў у складзе 20-й брыгады імя В.С. Грызадубавай [16, л. 28–38; 32, л. 89; 41, с. 60–62, 72–74, 85, 91; 47, л. 1].

Да канца 1943 г. пры ўдзеле расійскіх атрадаў на тэрыторыі заходніх абласцей БССР было створана 10 брыгад (Баранавіцкая – 6, Беластоцкая – 1, Вілейская – 3) ці 21 % ад усіх арганізаваных у рэгіёне за названы перыяд. Пры гэтым расійскія партызанскія падраздзяленні актыўна ўдзельнічалі ў забеспячэнні камандным кадрамі сумесна створаных брыгад. Іх прадстаўнікі ўзначалілі 60 % такіх злучэнняў.

Армейскім і чэкісцкім групам і атрадам, якія закідваліся на акупіраваную тэрыторыю, у якасці найважнейшай ставілася задача – зрываць дастаўку жывой сілы і тэхнікі працiўніка на Усходні фронт. Так, для пашырэння дыверсійнай дзейнасці на тэрыторыі Пінскай вобласці група на чале з Р.М. Ліньковым з пачатку лета 1942 г. устанавіла баявыя кантакты з брыгадай Ф.Ф. Капусты, атрадам імя М.Т. Шыша, падраздзяленнямі Мінскага партызанскага злучэння і аказала ім дапамогу ўзрыўчаткай, мінамі, інструкцыямі па тэхніцы мініравання, падрыхтоўкай падрыўнікоў. Восенню 1942 г. армейская група і партызаны брыгады Ф.Ф. Капусты сумесна пусцілі пад адхон сем эшалонаў на ўчастку чыгункі Гарадзея – Негарэлае [24, с. 119; 25, с. 325, 382–386].

Падраздзяленне В.В. Шчарбіны, якое мела сувязь з Цэнтрам і запас узрыўчаткі, з ліпеня 1942 г. уключыла атрады Налібоцкай пушчы ў правядзенне дыверсій на лініях Маладзечна – Ліда, Баранавічы – Мінск – Маладзечна. Па ініцыятыве В.В. Шчарбіны з мясцовых партызан было падрыхтавана каля 200 падрыўнікоў. За ліпень – верасень 1942 г. армейскі атрад і мясцовыя партызаны падарвалі разам 18 эшалонаў і 11 мастоў. Партызаны атрада ГРУ ГШ В.А. Чаркасава (а затым брыгады) з лета 1942 г. і да ліпеня 1944 г. падарвалі 275 эшалонаў. Брыгада імя М.В. Фрунзе, вырасшы з групы ГРУ ГШ М.М. Багатырова, з канца 1942 г. і да ліпеня 1944 г. пусціла пад адхон 114 эшалонаў. Усяго на баявым рахунку брыгад імя М.В. Фрунзе і С.М. Будзённага да 40 % ад агульнай колькасці эшалонаў, падарваных партызанамі Вілейскай вобласці [19, с. 334–335, 370–372; 20, с. 272; 25, с. 282; 28, л. 2; 30, л. 13; 31, л. 224; 34, с. 183, 198; 52, с. 87, 98; 54, с. 37–38].

Па ініцыятыве атрада І.П. Топкіна, які дзейнічаў на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, мясцовыя атрады былі размешчаны каля чыгунак Брэст – Баранавічы – Ваўкавыск, Брэст – Лунінец. Партызанам была аказана дапамога ўзраўчаткай і ў падрыхтоўцы падрыўнікоў. Армейскія мінёры правялі некалькі паказальных дыверсій на чыгункі. Так, 10 кастрычніка 1942 г. пры ўдзеле партызан 13-га атрада яны падарвалі два воінскія эшалоны на магістралі Брэст – Масква, з-за чаго перагон Нехачава – Івацэвічы не функцыянаваў 5 сутак. У другой палове кастрычніка 1942 г. атрады, падначаленыя І.Ф. Топкіну, скінулі пад адхон тры эшалоны і разбурылі 95-метровы мост праз Ясельду на шашы Хомск – Старамліны. 26 лістапада 1942 г. падчас сумеснай дыверсіі атрадамі І.Ф. Топкіна і М.В. Бабкова быў падарваны эшалон ў раёне станцыі Даманава і знішчана 150 нямецкіх лётчыкаў. Да лета 1943 г. армейскае падраздзяленне каардынавала дыверсійную дзейнасць амаль паловы атрадаў Брэсцкай вобласці. Толькі за люты 1943 г. яны пусцілі пад адхон 17 эшалонаў. У канцы мая 1943 г. зводная група ў складзе маскоўскіх дэсантнікаў і партызан з атрадаў Ружан-

скай пушчы колькасцю да 240 чалавек у раёне паўстанка Нехачава чыгункі Брэст – Баранавічы нанесла ўдар па пасажырскім саставе з гітлераўцамі і знішчыла каля 100 немцаў [25, с. 417, 438–442; 41, с. 122; 51, с. 64 – 65, 96].

Вясной 1943 г. для актывізацыі дыверсій у рэгіёне ЦШПР накіраваў з савецкага тылу пяць падраздзяленняў. Атрад «Кузнецкія металургі» (камандзір М.К. Вайцяхоўскі) свае баявыя дзеянні разгарнуў на чыгунцы Масты – Гродна – Ваўкавыск. За тры летнія месяцы партызанскае фарміраванне, якое пастаянна папаўнялася мясцовымі жыхарамі, вывела са строю 15 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, а ўсяго за перыяд да ліпеня 1944 г. падарвала 117 эшалонаў і 8 мастоў. З сібірскіх падраздзяленняў, якія дзейнічалі ў Баранавіцкай вобласці, найбольшы ўплыў на пашырэнне дыверсій аказаў атрад «Сібірак» (камандзір М.В. Пронькін). За лета – восень 1943 г. яго байцы навучылі падрыўной справе дзесяткі партызан Юрацішкаўскага і Іўеўскага раёнаў і ва ўзаемадзеянні з мясцовымі атрадамі на чыгунцы Ліда – Маладзечна падарвалі 186 рэек і чыгуначны мост, пусцілі пад адхон 8 эшалонаў, разбілі 8 паравозаў, 42 вагоны, 20 платформ. Падраздзяленні «Сібірак» і «Бальшавік» разам з мясцовымі атрадамі ў складзе брыгады «Уперад» за студзень – люты 1944 г. на чыгуначных участках Баранавічы – Ліда – Маладзечна пусцілі пад адхон 9 эшалонаў і разбілі 75 вагонаў. Усяго на баявым рахунку брыгады «Уперад» 29 знішчаных эшалонаў [11, с. 38–39; 23, с. 127–128; 27, 27, с. 201; 37, с. 160; 39, с. 202–203; 40, с. 209].

Такім чынам, за перыяд з сярэдзіны 1943 г. да ліпеня 1944 г. атрады ЦШПР і створаныя пры іх удзеле брыгады на тэрыторыі заходніх абласцей БССР вывелі са строю больш за 180 воінскіх эшалонаў праціўніка, падарвалі 8 мастоў, 1630 рэек, навучылі мінна-падрыўной справе і далучылі да дыверсійнай дзейнасці сотні мясцовых патрыётаў.

Атрады і групы НКУС (НКДБ) СССР у месцах сваёй дыслакацыі на тэрыторыі заходніх абласцей БССР не толькі дапамагалі партызанскім атрадам узрыўчаткай і мінамі, але і пасля адпаведанай падрыхтоўкі актыўна ўключалі насельніцтва ў дыверсійную дзейнасць. Чэкісцкі атрад «Сокалы» (камандзір К.П. Арлоўскі), большасць якога складалі мясцовыя жыхары, з канца 1942 г. і да ліпеня 1944 г. падарваў 16 эшалонаў і два масты, разбіў 100 вагонаў і платформ. Атрад «Дружба» (камандзір І.А. Жолабаў) самастойна і ва ўзаемадзеянні са створанымі ім дыверсійнымі групамі з патрыётаў Мастоў, Шчучына, станцыі Рожанка з красавіка да сярэдзіны ліпеня 1944 г. вывеў са строю 25 паравозаў і 169 вагонаў. Спецгрупы «Барацьбіты» (камандзір Д.П. Распопаў) і «Волаты» (камандзір А.М. Шыхаў) з канца лютага 1944 г. пры нанясенні ўдараў па чыгуначных лініях Баранавічы – Лунінец і Лунінец – Пінск узаемадзейнічалі з мясцовымі падраздзяленнямі, сярод якіх быў атрад імя М.І. Калініна. На баявым рахунку групы «Барацьбіты» ў Лунінецкім і Ганцавіцкім раёнах 55 аперацый і 35 падарваных эшалонаў. Група «Волаты» правяла 63 аперацыі, у выніку адной з іх на чыгунцы Баранавічы – Лунінец быў падарваны цягнік з жывой сілай праціўніка, разбіты 8 вагонаў і паравоз, забіта і паранена 160 нямецкіх салдат і афіцэраў [9, с. 452–453, 472; 12, с. 168; 13, с. 65, 75, 94; 14, с. 152, 154–155; 35, с. 167, 198].

Акрамя сумесных дыверсій па камунікацыях праціўніка беларускія і расійскія партызаны правялі разам некалькі паспяховых аперацый супраць нямецкіх гарнізонаў. У выніку разгрому 22 сакавіка 1944 г. мясцовымі атрадамі імя Р.І. Катоўскага, імя В.П. Чкалава, імя А.А Жданава і сібірскімі атрадамі «Бальшавік» і «Сібірак» буйнога гарнізона праціўніка ў вёсцы Лугомавічы быў ліквідаваны апорны цэнтр акупантаў, які кантраляваў значную тэрыторыю Іўеўскага раёна. У сярэдзіне мая 1944 г. атрад НКДБ СССР (камандзір А.П. Шастакоў) і брыгада імя І.В. Сталіна (камандзір П.І. Гулевіч) знішчылі апорны пункт праціўніка ў населеным пункце Камень, што прывяло да згортвання паліцэйскіх участкаў у навакольных вёсках і да аслаблення нямецкага гарнізона ў Івянцы. 3 ліпеня 1944 г. атрад С.Р. Суслава і 16-я Смаленская брыгада вызвалілі райцэнтр Свір і мястэчка Дабраўляны і ўстанавілі партызанскі кантроль за шашой Полацк – Вільнюс, якая мела важнае значэнне для наступлення часцей Чырвонай Арміі ў рэгіёне [11, с. 41–42; 26, с. 584; 34, с. 225–226; 37, с. 160–161].

У выніку ўстаноўлена, што ўзаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызанскіх фарміраванняў з'яўлялася важным фактарам пашырэння ўзброенай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх войск на акупіраванай тэрыторыі заходніх абласцей БССР з лета 1942 г. і да ліпеня 1944 г.

Літаратура і крыніцы

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыклапедыя. – Мінск: Бел СЭ, 1990. – 680 с.
2. Беседа с командиром партизанского отряда им. Суворова т. Леонтьевым А.Л. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 370. – С. 4–12.
3. Бессмертные имена. – Минск : Беларусь, 1979. – 255 с.
4. Боевой отчёт о партизанском движении Ленинской бригады // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 307. – С. 171–234.
5. *Бринский, А.П.* По ту линию фронта. Воспоминания партизана / А.П. Бринский. – 2-е доп. и перераб. изд. – Горький: Кн. изд., 1956. – 514 с.
6. *Бринский, А.П.* По ту сторону фронта: зап. партизана / А.П. Бринский. – Горький: Горьков. кн. изд-во, 1954. – 433 с.
7. Буг в огне: сборник. – Минск: Беларусь, 1965. – 527 с.
8. Докладная записка командира партизанской групы Азончика А.С. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 68. – С. 165.

9. Докладная записка о состоянии партизанского движения в Брестской области // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 365.–С. 86–100.
10. *Докладная, И.Ф.* Климава о дислокации бригад и отрядов по Вилейской области // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 68. – С. 171–172.
11. Дорогой мстителей. Воспоминания сибиряков-участников партизанского движения. – Новосибирск: Зап.-Сиб. кн. изд., 1969. – 87 с.
12. Динамовцы в боях за Родину: сборник. – Кн. 1. – М., 1975. – 241 с.
13. *Жолобов, И.А.* На Немане ждут своих / И.А. Жолобов. – Барнаул: Алт. кн. изд.-во, 1975. – 208 с.
14. *Зевелев, А.И.* Ненависть, спрессованная в тол / А.И. Зевелев, Ф.Л. Курлат, А.С. Казицкий. – М.: Мысль, 1991. – 331 с.
15. История возникновения, боевая деятельность и парт.-полит. работа партизанской бригады имени М.В. Фрунзе 1942–1944 гг. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 103. – С. 1–161.
16. История возникновения партизанской бригады «Вперед» Барановической области 1942–1944 гг. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 316. – С. 28–38.
17. История организации Брестского партизанского соединения // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 365. – С. 217–254.
18. *Касович, А.В.* Сопротивление германским оккупантам в западных областях Беларуси в годы Великой Отечественной войны 1941–1944 : дис...канд. ист. наук: 07.00.02 / А.В. Касович. – Минск, 2004. – 135 с.
19. *Климов, И.* Партизаны Вилейщины / И. Климов, Н. Граков. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск : Беларусь, 1970. – 420 с.
20. *Климов, И.Ф.* Далёкое и близкое / И.Ф. Климов. – Минск: Беларусь, 1987. – 335 с.
21. *Козак, К.И.* Роль Ивенецко-Налибокской зоны в развитии всенародной борьбы на территории Барановичской области / К.И. Козак // Партия. Народ. Победа: тез. конф. В 2 ч. – Минск, 1990. – Ч. 1. – С. 102–107.
22. Краткая история возникновения, организации и боевой деятельности партизанской бригады «Октябрь» // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 79. – С. 49–130.
23. *Кузнецов, В.И.* Сибирские добровольческие формирования в годы Великой Отечественной войны / В.И. Кузнецов // Сибирь в Великой Отечественной войне: материалы конф., посвящ. 30-летию Победы [16–18 апр. 1975 г.]. – Новосибирск, 1977. – С. 116–129.
24. *Линьков, Г.* Записки партизана / Г. Линьков – М., 1949. – 138 с.
25. *Линьков, Г.М.* Война в тылу врага / Г.М. Линьков. – Саранск, 1962. – 622 с.
26. Люди нарочанского края. Воспоминания. – Минск: Беларусь, 1975. – 592 с.
27. *Новиков, П.А.* Помощь Новосибирской партийной организации партизанскому движению / П.А. Новиков // Научные труды Новосибирского гос. ун-та. Сер. историческая. – Вып. 4. Вопросы истории Советской Сибири. – Новосибирск, 1970. – С. 194–205.
28. Опросный лист партизана Борисова И.И. из отряда им. Кузнецова бригады В.В. Щербины // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 305. – С. 2.
29. Отчет диверсионно-разведывательной деятельности бригады им. Буденного // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 99. – С. 193–243.
30. Отчет о боевой деятельности отряда имени Буденного с 26.5. 1942 г. по 28.8. 1943 г. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 99. – С. 13–17.
31. Отчет о боевой и политической деятельности отряда им. Кузнецова бригады им. Чкалова // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 305. – С. 210–241.
32. Отчет о состоянии партизанского движения в Барановичской области // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 294, т. 2. – С. 88–106.
33 Очерки истории белорусов в Сибири в XIX–XX вв. – Новосибирск, 2001. – 237 с.
34. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944). – Минск: Беларусь, 1983. – 765 с.
35. Памяць: Валожынскі р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 453 с.
36. Памяць: Дзятлаўскі р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск: Універсітэцкае, 1997. – 397 с.
37. Памяць: Івацэвіцкі р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск: БЕЛТА, 1997. – 494 с.
38. Памяць: Іўеўскі р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – 507 с.
39. Памяць: Клецкі р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 618 с.
40. Памяць: Мастоўскі р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск: Паліграфафармленне, 2002. – 591.
41. Памяць: Свіслацкі р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. – Мінск: Беларусь, 2004. – 525 с.
42. Политдонесение комиссара партизанской бригады им. Буденного // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 99. – С. 38–42.
43. Приказ № 024 по Особому соединению партизанских отрядов от 3 января 1943 г. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 303. – С. 36.
44. Приказ по соединению партизанских бригад им. Сталина № 018 от 28 февраля 1943 г. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 303. – С. 42.
45. Приказ по соединению партизанских бригад и отрядов им. Сталина от 20 марта 1943 г. № 044 // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 303. – С. 45.
46. Приказ уполномоченного ЦШПР и ЦК КП(б)Б по Барановической области № 001от 14 апреля 1943 г. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 303. – С. 48.
47. Рапорт Сухорукова о работе в тылу противника от 16 сентября 1943 г. // НА РБ. – Ф. 1450. – Воп. 4. – Спр. 310. – С. 1–3.
48. *Факторович, А.А.* Подпольные антифашистские организации – помощники КП(б)Б в борьбе против оккупантов на территории западных областей Белоруссии (1941–1944 гг.): автореф. дис...канд. ист. наук / А.А. Факторович. – Минск, 1967. – 29 с.
49. *Федотов, А.С.* Разведчики в тылу врага / А.С. Федотов. – М., 1963. – 207 с.
50. *Хацкевич, А.Ф.* Становление партизанского движения в Белоруссии и дружба народов СССР / А.Ф. Хацкевич, Р.Р. Кручок. – Минск : Наука и техника, 1980. – 320 с.
51. *Цветков, В.* Своими глазами. Записки разведчика / В. Цветков. – Минск : Беларусь, 1972. – 284 с.
52. *Шубин, Г.А.* Из истории всенародной борьбы против немецко-фашистских оккупантов в западных областях Белоруссии / Г.А. Шубин. – Волгоград : Нижне-Волж. кн. изд-во, 1972. – 312 с.
53. *Шумилов, И.Л.* В тылу врага / И.Л. Шумилов // Сибирские огни. – 1949. – № 2. – С. 56 – 83.
54. *Якубовский, Н.А.* В тыл врага / Н.А. Якубовский. – Минск: Беларусь, 1979. – 175 с.

Summary

This article is dedicated to such historical facts as those of a joint work of the Belarussian and Russian partisan brigades in the west of the BSSR in 1942. Different documents, carefully kept in the National Data Base of the Republic of Belarus, help to prove a joint formation of subdivisions and brigades the local partisan groupings, the Red Army, forest and the Siberian subdivisions.

Паступіў у рэдакцыю 01.04.2010 г.

✧ ✧ ✧